ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 10 (892) | Аўторак, 6 чэрвеня 1995г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ВЫБАРШЧЫКІ ПРАДЭМАНСТРАВАЛІ ПАСІЎНАСЦЬ

28 мая па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 86 па выбарах у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, як і па многіх іншых акругах, праходзіў другі тур галасавання. Як мы паведамлялі ў папярэднім нумары газеты, па нашай выбарчай акрузе працягвалі барацьбу за дэпутацкі мандат дырэктар Інстытута лесу АНБ В.А.Іпацьеў і юрыст прафсаюзнага банка Р.Ф.Фраловіч. У спісы было занесена 24027 выбаршчыкаў. Але толькі 9211 з іх выканалі свой грамадзянскі абавязак. Гэта 38,3%. Паколькі ў галасаванні прыняло ўдзел менш палову выбаршчыкаў, лічыцца, што выбары не адбыліся. Яны будуць назначаны на новы тэрмін і давядзецца вылучаць новых кандыдатаў у дэпутаты.

Дарэчы, з прыняўшых удзел у галасаванні ў другім туры за В.А.Іпацьева прагаласавала 60,7% выбаршчыкаў, за Р.Ф.Фраловіча — 25%. Здзіўляльную пасіўнасць прадэманстравалі выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты нашага універсітэта, якія галасавалі на выбарчым участку № 22, што размяшчаўся ў вучэбным корпусе №1. Тут прыняло ўдзел у галасаванні ўсяго толькі 18% выбаршчыкаў — самы нізкі паказчык па Гомелю.

## А ЦІ СФАРМІРУЮЦЦА МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ?

Не суцяшальныя вынікі выбараў у вышэйшы заканадаўчы орган рэспублікі нам ужо вядомы. А наперадзе — яшчэ адна загадкавая падзея. На 11 чэрвеня назначаны выбары ў мясцовыя Саветы. І чым яны закончацца, прадказаць цяжка. Але, відаць, і тут таксама не абыдзецца без збою. І гэта дадатковым цяжарам ляжа на наш жабрацкі бюджэт.

А цяпер нагадаем сваім чытачам, што ад калектыву выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў нашага універсітэта вылучаны і зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты: дэкан філалагічнага факультэта У.Д.Еўтухоў — у абласны, намеснік дэкана гісторыка-юрыдычнага факультэта І.В.Нямкевіч — гарадскі, загадчык кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК С.М.Гавейка — раённы Саветы.

## ВІНШУЕМ !

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта горача віншуюць загадчыка кафедры аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі ДЗЕМІДЗЕНКУ Алега Міхайлавіча, кандыдатаў навук КУРЫЛКІНУ Святлану Мікалаеўну з кафедры фізічнай метралогіі і ЕЛІСЕЕВУ Ірыну Міхайлаўну з кафедры псіхалагічнай дыягностыкі і падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ з выпадку прысваення ім Атэстацыйнай калегіяй Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнт.*

## АДБЫЛІСЯ СКАРЫНАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

Яны былі першымі на парадку пасяджэння савета універсітэта, якое адбылося 25 мая. З навуковымі дакладамі выступілі іх лаўрэаты дацэнты У.А.Бобрык з кафедры беларускай мовы і С.М.Курылкіна з кафедры фізічнай метралогіі. Рэктар член-карэспандэнт АНБ Л.А.Шамяткоў павіншаваў іх з дасягнутым поспехам, уручыў дыпломы лаўрэатаў Скарынаўскіх чытанняў і грашовыя прэміі.

Начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова выступіла з інфармацыяй аб задачах па падрыхтоўцы да новага навучальнага года.

Дэканы С.Ф.Алешка і А.П.Пінчук выступілі па пытаннях арганізацыі вучэбных і вытворчых практык адпаведна на біялагічным і геолага-геаграфічным факультэтах.

Савет заслухаў дэканаў М.І.Старавойтава і У.В.Арлова і зацвердзіў рабочыя вучэбныя планы па спецыяльнасцях "Гісторыя", " Правазнаўства" і "Матэматыка".

Былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны: прафесар У.І.Міроненка -- загадчыкам кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў, Н.С.Сердзюкова і Т.Я.Шаўчэнка -- старшымі выкладчыкамі кафедры рускай мовы для замежных навучэнцаў, С.В.Жагораў і Л.М.Ефіменка -- старшымі выкладчыкамі кафедры правазнаўства, Л.І.Багацікава -- дацэнтам кафедры англійскай мовы, А.П.Нарчук і П.В.Разько -- старшымі выкладчыкамі кафедры нямецкай і французскай моў, Г.У.Невяроўская -- старшым выкладчыкам кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці, У.В.Мухін -- дацэнтам кафедры матэматычнага аналізу, А.М.Краснова -- старшым выкладчыкам кафедры беларускай мовы, Л.В.Зашчук -- старшым выкладчыкам кафедры філасофіі, В.С.Каржоў -- дацэнтам кафедры эканомікі і сацыялогіі працы.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

• 1 Парламент не ўкамплектаваны. Новыя лаўрэаты.

• 2 На адпачынак у Італію. Працоўны семестр-95.

• 3-4 У сесіі — свае законы. На міжнародным кангрэсе і рэспубліканскай канферэнцыі.

• 5-6-7-8 "Зялёны клас". За здаровы лад жыцця. Для жадаючых паступіць у аспірантуру.

## 11-га чэрвеня -- выбары ў мясцовыя Саветы

**КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА РАЕННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПА УНІВЕРСІТЭЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 28 ГАРБАЧОЎ АНДРЭЙ АЛЯКСЕЕВІЧ, СТУДЭНТ ГІСТОРЫКА-ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ф.СКАРЫНЫ**



ГАРБАЧОЎ А.А. нарадзіўся ў сям'і рабочых. Беларус. Карэнны гамяльчанін. Скончыў СШ № 26. У 1992 г. уступіў у Саюз Моладзі Беларусі. Узначальваў школьны камітэт СМБ. Зараз з'яўляецца членам бюро абласнога камітэта Беларускага Саюза Моладзі. Беспартыйны.

У СВАЁЙ ПЕРАДВЫБАРНАЙ ПРАГРАМЕ НАШ КАНДЫДАТ ВЫСТУПАЕ ЗА:

-- раўнаправе рускай і беларускай моў;

-- паляпшэнне матэрыяльнай базы ГДУ і сацыяльную абарону студэнтаў;

-- правядзенне маладзёжнай палітыкі дзяржавы пры актыўным удзеле маладзёжных грамадскіх арганізацый;

— правапарадак і законнасць у горадзе;

— правядзенне азелянення і добраўпарадкавання вуліц, падтрымку чысціні ў горадзе.

НАШ КАНДЫДАТ -- студэнт, таму ўсе праблемы студэнцтва яму добра блізкія і вядомыя.

НАШ КАНДЫДАТ малады, таму сумленны і не схільны да карупцыі.

НАШ КАНДЫДАТ -- адукаваны малады чалавек, ён заклікае захоўваць закон і ахоўваць акаляючае асяроддзе.

ПАВАЖАНЫЯ ВЫБАРШЧЫКІ!

Калі Вы ўжо не студэнты, то, магчыма, Вашы дзеці і ўнукі будуць імі. Падумайце аб будучым. Падумайце аб тым, у якім горадзе будуць жыць яны.

Галасуйце за ГАРБАЧОВА АНДРЭЯ АЛЯКСЕЕВІЧА!

**Гарбачоў А.А.** -- гэта кандыдат маладых!

Галасуючы за маладых, Вы галасуеце за здаровае грамадства ў будучым!

**ГРУПА ПАДТРЫМКІ.**

## ГОСЦЬ -- ЗАМЕЖНЫ ВУЧОНЫ



На гэтым здымку вы бачыце прафесара з універсітэта г.Кіля шырока вядомага германскага банкіра Манфрэда Хейса. На працягу тыдня ў мінулым месяцы ён быў госцем нашага універсітэта. Вучоны і практык выступаў з лекцыямі перад студэнтамі эканамічнага факультэта і правёў два "круглыя сталы" з яго выкладчыкамі па праблемах нямецкай банкаўскай сістэмы і сістэмы банкаўскага абарачэння. Кожная сустрэча з ім была даволі карыснай, выклікала шмат пытанняў.

**Фота У.Чысціка.**

## ДЗЕЦІ ПАЕДУЦЬ У ІТАЛІЮ

Няма, бадай, на сённяшні дзень для бацькоў праблемы больш важнай, чым аздараўленне сваіх дзяцей у час летніх канікулаў. Іх занепакоенасць зразумець няцяжка. Жывем у забруджанай радыяцыяй зоне, і адпачынак школьнікаў у чыстых месцах больш чым пажаданы. Аднак складаная эканамічная сітуацыя, якая назіраецца ў краіне, адмоўна ўплывае і на сферу, звязаную са здароўем людзей. Не хапае грашовых сродкаў, каб задаволіць просьбы жадаючых атрымаць лячэбныя і аздараўляльныя пуцёўкі.

У нашым універсітэце яго кіраўніцтва і прафком шукаюць шляхі выхаду са складанага становішча. Сёлета, у прыватнасці, праз абласны фонд "Дапамога дзецям Чарнобыля" дзецям выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ выдзелена 188 месцаў для паездкі на аздараўленне ў Італію. Хлопчыкі і дзяўчынкі 8-12-гадовага ўзросту на працягу месяца /ліпеня або жніўня/ будуць адпачываць у сонечнай краіне Міжземнамор'я.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

*Працоўнае лета-95*

## ЧАКАЕ СТАЎРАПОЛЛЕ

Яркай і адметнай асаблівасцю студэнцкага жыцця з'яўляліся раней трэцця працоўныя семестры. Пасля здачы экзаменацыйнай сесіі сотні студэнтаў адпраўляліся ў самыя розныя куткі былога Саюза, каб папрацаваць на будаўнічых аб'ектах, у сельскай гаспадарцы, а таксама праваднікамі на чыгунцы і сцюардэсамі ў аэрафлоце. Тады летні семестр прыносіў моладзі як маральнае задавальненне, так і неблагую матэрыяльную падтрымку. Гэта быў час цікавы і непаўторны, правяралася на моцнасць і студэнцкая дружба, лета ў атрадзе ўсебакова "высвечвала" асобу чалавека, яго маральныя якасці. Было, праўда, у тыя часы і нямала залішняй парадкасці і заарганізаванасці ў правядзенні працоўных студэнцкіх семестраў. Аднак каштоўным з'яўлялася тое, што моладзь далучалася да актыўнай фізічнай працы, зведвала сапраўдную цану заробленых уласнымі рукамі грошай. А яны для студэнта лішнімі не былі, калі ўлічваць невялікі памер стыпендыі.

Цяпер жа ўсё інакш. І эканамічныя цяжкасці, разрыў сувязей паміж рэспублікамі не даюць ранейшых магчымасцей для студэнцкай працы. І ў моладзі змяніліся каштоўнасныя арыенціры – грошы /і паболей/ хочуць мець многія, але зарабіць іх, як яна лічыць, можна больш лёгкімі і даступнымі метадамі: у якасці мянялаў каля абменных пунктаў валюты , тых жа "чаўнакоў", якія жывуць па прынцыпу "купі-прадай".

І тым не менш, сёлета ў нашым універсітэце аб'яўляецца набор жадаючых паехаць у ліпені і жніўні на сельскагаспадарчыя работы ў Стаўрапольскі край. 150 студэнтаў ГДУ маюць магчымасць зарабіць грошы сваёй працай.

За даведкамі звяртацца ў прафком студэнтаў.

**Т.ДУБЯК.**



## На кангрэсе беларусістаў

Другі міжнародны кангрэс беларусістаў праходзіў у Мінску з 15 па 19 мая. У ім прынялі ўдзел 170 даследчыкаў беларускай мовы, літаратуры, гісторыі, асветы і культуры з 17 краін свету, у тым ліку з Англіі, ЗША, Японіі, Фінляндыі, Венгрыі, Германіі. Значная колькасць беларусістаў прыехала з Польшчы, Літвы, Украіны. На кангрэсе выступалі вядомыя навукоўцы Масквы – В.Сядоў, Я.Шыраеў, А.Каўка, Ю.Лабынцаў, І.Касцюшка, вучоныя Санкт-Пецярбурга, Рыгі і іншых замежных навуковых цэнтраў.

Актыўна ўдзельнічалі ў рабоце кангрэса навукоўцы Беларусі -- навуковыя супрацоўнікі Акадэміі навук, супрацоўнікі Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны, Нацыянальнага інстытута адукацыі, выкладчыкі Беларускага, Гродзенскага, Гомельскага дзяржуніверсітэтаў, Беларускай акадэміі мастацтваў, Беларускай акадэміі музыкі, Беларускага дзяржуніверсітэта культуры, Беларускага дзяржпедуніверсітэта, Брэсцкага, Віцебскага дзяржпедінстытутаў і інш.

На пленарным пасяджэнні выступілі з дакладамі Джым Дынглі, прафесар, віцэ-прэзідэнт МАБ/Англія/, Вітаўт Кіпель, дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва /ЗША/, Алесантары Ахола-Вало, фінскі, шведскі і беларускі мастак, філосаф /Фінляндыя/, Эльжбета Смулэк, пасол рэспублікі Польшча, Ніл Гілевіч, старшыня камісіі па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны ВС РБ, Яўген Шыраеў, прэзідэнт Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі /Масква/ і інш.

Кангрэс быў прысвечаны абмеркаванню праблемы "Беларусь паміж Усходам і Захадам". Першыя два дні /16-17 мая/ працавалі секцыі: "Міжнацыянальныя адносіны", "Міжканфесійнае ўзаемадзеянне", "Гісторыка-культурныя ўзаемадачыненні", "Моўныя і літаратурныя кантакты", "Беларуская дыяспара", "Пытанні адукацыі". З дакладамі на пленарных пасяджэннях выступілі і выкладчыкі Гомельскага дзяржуніверсітэта – У.В.Анічэнка, прафесар кафедры беларускай мовы, дактарант кафедры беларускай літаратуры В.К.Шынкарэнка, аўтар гэтых радкоў.

18-19 мая адбыліся пасяджэнні круглых сталоў "Беларуска-латышскія, беларуска-літоўскія, беларуска-польскія, беларуска-расійскія, беларуска-украінскія гістарычна-культурныя ўзаемадачыненні", "Лёсы беларускіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей у час другой сусветнай вайны і пасля яе /перамяшчэнне, выяўленне, вяртанне/."

У апошні дзень работы кангрэса адбылася перадача некаторых каштоўнасцей дэлегацыяй з Германіі.

Праца секцый праходзіла ў спакойнай, творчай атмасферы. У час кангрэса адбыліся справаздачна-выбарчы сход дэлегатаў кангрэса, пасяджэнне Міжнароднага камітэта беларусістаў, на якім абраны новы склад камітэта МАБ. Ад Гомельскай вобласці ў склад камітэта МАБ быў абраны прафесар У.В.Анічэнка. Старшынёю МАБ абраны А.Мальдзіс.

Насычанай была культурная праграма кангрэса – бенефіс артысткі Таццяны Мархель, канцэрты аўтэнтычнага фальклору, беларускай класічнай музыкі, наведванне музеяў.

**А.СТАНКЕВІЧ,**
**загадчыца кафедры беларускай мовы.**

## ПРАБЛЕМЫ НАВУКОВАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Дзяржаўная самастойнасць нашай рэспублікі, яе незалежнасць і самабытнасць патрабуюць паскоранага развіцця культуры і навукі беларускага народа. Найбольш востра адчуваецца ў сувязі з гэтым нераспрацаванасць навуковай тэрміналогіі.

Дадзеную праблему асабліва добра ўсвядомілі міністэрствы адукацыі і навукі, культуры і друку, Акадэмія навук, Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны і Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф.Скарыны, бо менавіта яны 18-19 мая арганізавалі і паспяхова правялі другую нацыянальную канферэнцыю "Праблемы беларускай навуковай тэрміналогіі".

Аўтару гэтых радкоў пашчасціла ўдзельнічаць у гэтай і ў мінулагодняй канферэнцыі, якая праводзілася ў пачатку мая. Міжволі напрошваецца параўнанне.

Першую канферэнцыю наладжвала разам з арганізатарамі другой яшчэ і выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" імя П.Броўкі. Летась на пленарным пасяджэнні канферэнцыі выступілі з прывітаннем і паведамленнямі намеснік міністра адукацыі В.Стражаў, міністр культуры і друку А.Бутэвіч, галоўны рэдактар выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" імя П.Броўкі Б.Сачанка. Сёлета афіцыйных прадстаўнікоў гэтых уладных структур не было.

З гэтага вынікае, што цікавасць дзяржаўных органаў да праблем нацыянальнай навуковай тэрміналогіі прыкметна аслабла.

Вынікі і ход абедзвюх названых канферэнцый вельмі яскрава даказваюць: увага да праблем нашай навуковай тэрміналогіі ўзрасла ў міжнароднай і беларускай грамадскасці. Калі ў першай канферэнцыі ўдзельнічалі выключна айчынныя навукоўцы, дык у другой іх шмат было і з блізкага і далёкага замежжа. У першай былі заяўлены 104 навуковыя даклады, у другой — 125.

Абедзве канферэнцыі ўключалі па тры секцыі: гуманітарныя, прыродазнаўчыя і фізіка-тэхнічныя навукі і прайшлі на высокім творчым узроўні.

Звяртае на сябе ўвагу, што першую навуковую канферэнцыю БНФ удалося ў немалой ступені выкарыстаць як свой палітычны фарс. Былі спробы павярнуць у гэтым жа напрамку і другую, але на гэты раз палітычныя заклікі і песімізм навукоўцаў-бэнээфаўцаў выклікаў у залы красамоўнае маўчанне або нават асуджальныя рэплікі. Першая большасцю галасоў прыняла ваяўнічае патрабаванне да ўрада, пастанова ж другой была досыць памяркоўная, заснаваная толькі на навуковых праблемах.

У абедзвюх канферэнцыях прыняў удзел і выступіў старшыня Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны, старшыня камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі і захаванню нацыянальнай спадчыны Ніл Сымонавіч Гілевіч.

Актыўна ўдзельнічалі ў іх выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі нашага універсітэта. У праграму мінулай канферэнцыі былі ўключаны навуковыя даклады В.А.Ляшчынскай, Д.Д.Паўлаўца, Л.П.Кузьміча, А.А.Станкевіч /кафедра беларускай мовы/, сёлетняй -- У.В.Анічэнкі, Л.М.Мінаковай, А.А.Станкевіч, В.А.Адзіночанкі, Л.П.Кузьміча, Д.Д.Паўлаўца, В.Ф.Сенінай, Л.М.Сапегіна, студэнта А.Пуканава.

Сучаснае цяжкае эканамічнае становішча рэспублікі з'яўляецца галоўнай прычынай таго, што навуковыя даклады першай канферэнцыі не могуць укараняцца ў навуковы ўжытак, не выйшаўшы асобным выданнем. Праўда, арганізатары запэўнілі, што не пазней чым у лістападзе 1995 г. кніга з дакладамі ўсё ж будзе выпушчана. Навуковыя працы другой канферэнцыі могуць і не быць надрукаванымі, калі меркаваць па вопыту выдання прац першай.

Думаецца, што арганізатары, а тым больш дзяржаўныя органы добра ўсведамляюць, што канферэнцыі праводзяцца не для галачкі, а для ўкаранення іх вынікаў у практыку, галоўным механізмам якога з'яўляюцца надрукаваныя зборнікі.

Мы ўпэўнены, што ў беларускай дзяржавы знойдуцца сродкі на развіццё філалагічнай навукі і яе важнейшай састаўной часткі — навуковай тэрміналогіі.

**К.УСОВІЧ,**
**заг.музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

# У СЕСІІ -- СВАЕ ЗАКОНЫ

Як вельмі дакладна заўважана гумарыстамі, студэнт -- гэта той чалавек, які два разы на год памірае, але часцей, як Фенікс, паспяхова адраджаецца. Лёгка здагадацца, што маецца на ўвазе: двойчы студэнт трымае выпрабаванне на веды -- у зімовую і летнюю экзаменацыйныя сесіі. І цяпер, у гэтыя гарачыя чэрвеньскія дні, у яго чарговы "аўрал". Выкладчыкі, патрабавальныя і строгія, чакаюць ад яго "справаздачы" за праслуханыя курсы лекцый, і яму, як часцей за ўсё бывае, даводзіцца літаральна за 2-3 дні, прыхапіўшы яшчэ і ночы, праштудзіраваць падручнікі і канспекты. У выніку гэта ў большасці выпадкаў заканчваецца паспяхова, і ў залікоўцы з'яўляецца запаветная станоўчая адзнака. Здараюцца і збоі, што студэнтам успрымаецца не самым трагічным чынам. І гэта -- законы сесіі: займаўся больш-менш рэгулярна, атрымаеш жаданую пяцёрку або чацвёрку, а калі не -- давядзецца прыйсці на сустрэчу з выкладчыкам яшчэ раз.

Так склалася, што чэрвень -- самы напружаны і хвалюючы для студэнтаў ГДУ месяц. Тут і экзамены за чарговы семестр, і экзамены дзяржаўныя, выпускныя, і абарона дыпломных работ. У вучэбных карпусах -- як у тым бурлівым віры: і заклапочаныя твары, і радасныя, з усмешкамі.

Многія паспелі ўжо скінуць з плячэй груз залікаў і экзаменаў і ўздыхнулі з палёгкай. Цяпер у іх -- менш хвалюючы перыяд -- вытворчая практыка. Такая, напрыклад, сітуацыя ў чацвёртакурснікаў эканамічнага факультэта. У групе ЭСТ-42, студэнты якой выбралі спецыялізацыю "Арганізацыя і ўлік знешнеэканамічнай дзейнасці", справы вучэбныя ідуць лепшым чынам. Тут з 29 чалавек 6 здалі ўсе чатыры экзамены толькі на выдатныя адзнакі, 16 -- на добрыя, чым забяспечылі сабе павышаную стыпендыю. Група дружная, адказная, у чым немалая заслуга яе старасты, выдатніцы Тамары Попчанка. Прыкладам для астатніх студэнтаў з'яўляюцца таксама Наталля Глушакова, Ірына Піменава, Ірына Сталярова, Таццяна Пільчук, Сяргей Худзякоў.



У залікоўцы першакурсніка біялагічнага факультэта Уладзіміра Собчанкі пасля экзамена па аналітычнай хіміі з'явілася выдатная адзнака. Так ацаніла яго веды дацэнт В.Р.Свірыдзенка.



Цудоўны настрой ад вышэйшай адзнакі па лацінскай мове ў студэнткі І курса спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" Маі Мяркулавай.

Калі ж узяць другую групу ЭСТ-41 і параўнаць вынікі экзаменаў з названай вышэй, то, на жаль, параўнанне будзе не ў яе карысць. Тут усяго толькі 6 чалавек могуць разлічваць на атрыманне павышанай стыпендыі за добра здадзеныя экзамены. Ёсць нават і двоечнікі.

2 чэрвеня завяршылася сесія і ў трэцякурснікаў спецыяльнасці "ЭСТ". Грунтоўныя і выдатныя веды паказалі на іх студэнты Ігар Базылік, Алена Гарпушкіна, Наталля Явіліна, Дзмітрый Казлоў, Вольга Янкоўская.

У другакурснікаў і першакурснікаў эканомфака экзамены яшчэ наперадзе. У іх насычаная вучэбная праграма, лекцыі, практычныя заняткі працягваліся да пачатку чэрвеня. Так што экзаменацыйных хваляванняў ім яшчэ хопіць. Таму застаецца пажадаць ім толькі выдатных і добрых адзнак.

**(Наш кар.)**

Фота Чысціка.



Прыемным падарункам у дзень свайго 20-годдзя была для трэцякурсніцы эканамічнага факультэта Таццяны Вернікоўскай выдатная адзнака на экзамене па бухуліку, які прымала дацэнт Т.І.Панова.



Экалагічнае выхаванне

# ПРАЕКТ "ЗЯЛЁНЫ КЛАС"

**У Гомелі пачало сваю дзейнасць абласное аддзяленне Беларускага Фонду Сораса, у прыярытэтныя задачы якога ўваходзіць падтрымка грамадскіх пачынанняў у галіне аховы здароўя, экалогіі і экалагічнай адукацыі. Адным з першых быў зацверджаны і прыняты да рэалізацыі праект "Зялёны клас", кіраўніком якога з'яўляецца дацэнт нашага універсітэта, кандыдат педагагічных навук Г.М.Каропа. Праект падтрымліваецца таксама Беларускай партыяй Зялёных. Мы сустрэліся з кіраўніком праекта "Зялёны клас" і папрасілі адказаць на некалькі пытанняў.**

*-- Генадзь Мікалаевіч, Ваш праект, наколькі вядома, прысвечаны праблеме экалагічнай адукацыі і выхавання школьнікаў. Хацелася б даведацца больш падрабязна аб мэтах, асноўных задачах, змесце, аб складзе ўдзельнікаў праекта "Зялёны клас".*

-- Экалагічная адукацыя і выхаванне, накіраваныя на фарміраванне ў шырокіх слаёў насельніцтва адказных адносін да прыроды, разглядаецца ва ўсім свеце як асноўны шлях і ўмова вырашэння сучасных экалагічных праблем і аптымізацыі адносін чалавека і грамадства з прыродай. Агульнапрызнана, што веды, каштоўнасныя арыентацыі і адносіны, якія фарміруюцца ў працэсе экалагічнага выхавання, уносяць істотны ўклад у агульнае развіццё асобы.

Актуальнасць гэтай праблемы сёння не выклікае пярэчанняў і адзначаецца ў многіх дзяржаўных і міжнародных дакументах, падкрэсліваецца рознымі міжнароднымі арганізацыямі, у тым ліку з сістэмы ААН. Для Гомельскай вобласці і Рэспублікі Беларусь у цэлым, якія характарызуюцца, як вядома, радыяцыйным забруджаннем, гэта праблема мае асабліва важнае значэнне і азначаную спецыфіку. Аднак, як паказвае практыка, педагагічныя калектывы агульнаадукацыйных школ у вырашэнні задач экалагічнага выхавання школьнікаў сутыкаюцца з пэўнымі цяжкасцямі, самымі істотнымі сярод якіх з'яўляюцца, па-першае, нераспрацаванасць навуковых і метадычных асноў экалагічнай адукацыі, па-другое, непадрыхтаванасць настаўнікаў-прадметнікаў і класных кіраўнікоў да работы па дадзенаму накірунку. Праект "Зялёны клас" заклікаы ў азначанай меры папоўніць гэты прабел.

Мэта нашага праекта заключаецца ў стварэнні сістэмы метадычнага забеспячэння працэсу экалагічнай адукацыі і выхавання вучняў агульнаадукацыйных школ, а таксама ў садзейнічанні экалагічнаму выхаванню школьнікаў і студэнтаў педагагічных ВНУ. Гэта мэта дасягаецца праз фарміраванне новага педагагічнага вопыту экалагічнай адукацыі шляхам правядзення эксперыментальнай работы, абагульненне гэтага вопыту і стварэнне на яго падставе новых методык экалагічнай адукацыі і выхавання навучэнцаў 5-11 класаў, распрацоўку вучэбных праграм, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і кніг для навучэнцаў, укараненне новых методык у практыку работы школ рэспублікі, прапаганду вопыту экалагічнай адукацыі, прыцягненне ўвагі шырокай грамадскасці да пытанняў стану прыроднага асяроддзя і ідэй беражлівых адносін да прыроды.

*-- Вы сказалі, што ў задачы праекта ўваходзіць распрацоўка вучэбных праграм, падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў і навучэнцаў і гэта, напэўна, з'яўляецца адметнай рысай Вашага праекта ад іншых творчых груп педагогаў-даследчыкаў, якія абмяжоўваюць сваю работу, як правіла, фарміраваннем і абагульненнем свайго вопыту. Якія іменна праграмы і вучэбныя дапаможнікі распрацоўвае група "Зялёны клас?"*

-- Намі распрацоўваецца вучэбная праграма па курсу "Асновы агульнай экалогіі" /5-11 кл./, якая рэалізуе ідэю цэнтральнага курса ў экалагічнай адукацыі. Гэты курс, на нашу думку, павінен не толькі ўзяць на сябе ўсю галоўную адказнасць за экалагічную адукацыю школьнікаў, але і забяспечыць узаемасувязь усіх школьных прадметаў, форм і метадаў у працэсе фарміравання ў навучэнцаў адказных адносін да прыроды. Акрамя таго, група "Зялёны клас" распрацоўвае праграмы факультатыўных курсаў "Акаляючае асяроддзе, чалавек і яго здароўе" /9 кл./, "Экалогія і культура" /10-11 кл./, "Экалогія чалавека" /10-11 кл./.

На іх аснове распрацоўваюцца вучэбна-метадычныя дапаможнікі "Асновы экалагічнай адукацыі", "Міжпрадметны падыход да экалагічнай адукацыі", "Экалагічная адукацыя і выхаванне ў навучанні геаграфіі" і інш., а таксама кніга для навучэнцаў "Чалавек, яго здароўе і навакольнае асяроддзе", у якой галоўная ўвага будзе ўдзелена пытанням радыяцыйнай экалогіі і раскрыццю некаторых магчымых шляхоў абароны арганізма ад іанізуючага выпраменьвання. Група "Зялёны клас" плануе апублікаваць таксама ў мясцовым і рэспубліканскім друку шэраг вучэбна-метадычных артыкулаў для настаўнікаў-прадметнікаў і класных кіраўнікоў.

*-- Генадзь Мікалаевіч, распрацоўкай падобных матэрыялаў у нашай краіне займаліся і займаюцца навукова-даследчыя інстытуты і навукова-метадычныя лабараторыі. Відавочна, гэта работа пад сілу толькі буйным творчым калектывам. Якія гарантыі таго, што ўся праграма "Зялёнага класа" будзе выканана?*

-- Так, я згодны з тым, што распрацоўкай падобных матэрыялаў павінны займацца інстытуты і лабараторыі. Аднак значных вынікаў іх дзейнасці не бачна. "Зялёны клас" сёння рэальна ўяўляе адзін з навукова-метадычных цэнтраў, створаных па грамадскай ініцыятыве, а не ў адміністрацыйна-загадавым парадку. Гэта ініцыятыва ідзе ад практыкі і ў канчатковым выніку арыентавана на рэальную практыку сучасных школ. Усе ўдзельнікі праекта ўсведамляюць сацыяльную і педагагічную значнасць гэтай ра-

**(Заканчэнне на 6 стар.)**

Экалагічнае выхаванне

# ПРАЕКТ "ЗЯЛЁНЫ КЛАС"

(Заканчэнне. Пачатак на 5 стар.)

боты, высока матываваны і маюць дастатковы ўзровень дасягненняў у галіне экалагічнай адукацыі школьнікаў. У большасці удзельнікаў праекта ёсць навуковыя і вучэбна-метадычныя публікацыі па гэтай праблеме, вопыт многіх з іх шырока вядомы ў рэспубліцы. Відавочна, што многія настаўнікі-практыкі, якія ўдзельнічаюць у праекце, унеслі ў дзейнасць групы не толькі ўсведамленне важнасці праблемы, не толькі жаданне працаваць, але і свой багаты вопыт, свае прапановы, ідэі, адпрацаваныя методыкі. Падкрэсліваю, "Зялёны клас" пачынае сваю дзейнасць далёка не з нуля. Акрамя таго, ён абапіраецца на сваю распрацаваную канцэпцыю. Што ж датычыцца вучэбных праграм, зместу дапаможнікаў і г.д., то галоўнае ў гэтай рабоце -- найперш знайсці, выпрацаваць некаторы агульны падыход, базавы прынцып, кіруючую ідэю, на якую можна "нанізваць" вялікую колькасць фактаў, прыкладаў і г.д. Такія ідэі, прынцыпы, падыходы намі строга азначаны і паслядоўна рэалізуюцца ў нашай рабоце.

*-- Ваш праект арыентаваны на экалагічнае выхаванне навучэнцаў сярэдніх і старэйшых класаў агульнаадукацыйных школ і з яго зусім "выпадаюць" пытанні экалагічнага выхавання дашкольнікаў і вучняў пачатковых класаў, экалагічнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, у тым ліку педагагічных, павышэння іх кваліфікацыі і г.д. Гэта недагляд або імкненне сканцэнтравацца на адным або некалькіх участках работы?*

-- Мы дастаткова ясна ўсведамляем, што экалагічная адукацыя павінна насіць бесперапынны характар і ахопліваць школу, сям'ю, дзіцячыя дашкольныя і пазашкольныя ўстановы, ВНУ, сістэму павышэння кваліфікацыі і г.д. Больш таго, бесперапыннасць разглядаецца намі як важнейшая ўмова эфектыўнасці экалагічнай адукацыі і выхавання. Таму мы проста не можам не цікавіцца гэтымі пытаннямі, і мы старанна вывучаем адпаведны вопыт. Але мы вырашылі заняцца і займаемся тым звяном, у якім маем найбольш высокі ўзровень дасягненняў, з'яўляемся дастаткова нядрэннымі спецыялістамі і, такім чынам, можам забяспечыць значны рух наперад. Гэта, па-першае. Па-другое, як вядома, нельга "объять необъятное", але можна, "ухапіўшыся" за адно важнейшае звяно, "выцягнуць" сістэму ў цэлым. Такім звяном аб'ектыўна з'яўляецца экалагічная адукацыя вучняў сярэдніх /падлеткавых/ класаў. У псіхалогіі і педагогіцы даказана, што іменна ў падлеткавым ўзросце ў дзяцей складваецца здольнасць думаць абстрактна, з'яўляецца цікавасць да прычынна-следчых сувязей вывучаемых з'яў прыроды, развіваецца тэарэтычнае мысленне і г.д., што мае прынцыпова важнае значэнне для фарміравання норм адказных адносін да прыроды. Мы займаемся таксама экалагічнай адукацыяй старшакласнікаў. Што ж датычыцца экалагічнай адукацыі і выхавання вучняў малодшых класаў, то мы плануем правядзенне спецыяльнай вопытна-эксперыментальнай работы ў наступным навучальным годзе на базе школ Гомеля, Мінска і Мінскай вобласці. Пытанні аб перападрыхтоўцы кадраў / у тым ліку педагагічных/ і стварэння спецыяльнага вучэбна-метадычнага цэнтра па пытаннях экалагічнай адукацыі і выхавання школьнікаў будуць пастаўлены пасля распрацоўкі адпаведных праграм, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і г.д.

*-- Калі ласка, прадстаўце ўдзельнікаў праекта "Зялёны клас". Па якіх крытэрыях фарміраваўся яго састаў?*

-- Усяго ў групе 8 чалавек. У праекце ўдзельнічаюць высокакваліфікаваныя педагогі-практыкі, настаўнікі вышэйшай катэгорыі Н.А.Кароткая /СШ N 56 г.Гомеля/, Л.Ф.Сіткарова /СШ N 29 г.Гомеля/, В.Н.Церашкова /Галавінская СШ Гомельскага раёна/. Вопыт гэтых настаўнікаў шырока асвятляўся ў рэспубліканскім і мясцовым друку. На базе гэтых школ неаднаразова праводзіліся рэспубліканскія і абласныя семінары. У праекце таксама прымаюць удзел Е.А.Рубанава /СШ N 45 г.Гомеля/ і І.О.Цішчанка /Урыцкая СШ Гомельскага раёна/ -- таленавітыя выпускнікі ГДУ, якія выканалі пад маім кіраўніцтвам свае дыпломныя праекты па праблеме экалагічнай адукацыі школьнікаў, Ф.Ф.Бурак /начальнік Гомельскай лесаўпарадкавальнай экспедыцыі/ і С.А.Мацвіенка /вядучы супрацоўнік арганізацыі "Экалогія і кантроль навакольнага асяроддзя"/ -- аўтары шматлікіх публікацый па экалогіі і экалагічнай адукацыі, "генератары" многіх наватарскіх ідэй і прапаноў па праблеме экалагічнага выхавання. Агульнае, навуковае і метадычнае кіраўніцтва дзейнасцю "Зялёнага класа" ажыццяўляецца мною. Ва ўсіх удзельнікаў праекта розны стаж і вопыт, але галоўнае - - мы аднадумцы і ўсведамляем важнасць і адказнасць узятых на сябе абавязацельстваў. Акрамя таго, мы супрацоўнічаем з дзесяткамі школьных настаўнікаў, педагогаў-даследчыкаў, вучонымі /біёлагамі, эколагамі, географамі, псіхолагамі, метадыстамі і інш./ з многіх абласцей Беларусі і краін блізкага і далёкага замежжа.

*-- Калі ласка, некалькі слоў пра сябе як кіраўніка праекта "Зялёны клас".*

-- Пасля заканчэння геаграфічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта працаваў настаўнікам геаграфіі, метадыстам, заг. кабінета выхаваўчай работы Гомельскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў. Скончыў аспірантуру пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.М.Горкага. Абараніў кандыдацкую дысертацыю па праблеме экалагічнай адукацыі і выхавання школьнікаў. З 1991 года -- на выкладчыцкай рабоце ў ГДУ імя Ф.Скарыны. Дацэнт. Апублікаваў больш 30 навуковых і вучэбна-метадычных прац па псіхолага-педагагічнай тэматыцы, у тым ліку манаграфію "Сістэмны падыход да экалагічнай адукацыі і выхавання" /Мінск, "Университетское", 1994/. Акрамя экалагічнай адукацыі і выхавання, сферай навуковых інтарэсаў з'яўляюцца псіхалогія і методыка навучання геаграфіі, а таксама педагагічная псіхалогія.



За здаровы лад жыцця

# ПАЧЫНАЙЦЕ ДЗЕНЬ З ЗАРАДКІ

Праца студэнта адрозніваецца высокімі патрабаваннямі да мысліцельных працэсаў. У ходзе разумовай работы адбываюцца значныя змяненні такіх псіхалагічных працэсаў як памяць, увага, мысленне.

Малярухомая, сядзячая работа садзейнічае зніжэнню ўзроўню абмену рэчываў і акісляльных працэсаў, застою крыві ў органах брушной поласці і ў ніжніх канечнасцях. А ў такім палажэнні студэнты знаходзяцца ў сярэднім 8-10 гадзін у суткі.

Доўгія разумовыя перагрузкі ў студэнтаў, асабліва пры незахоўванні рэжыму працы і адпачынку, могуць прывесці да нярвова-псіхалагічнага перанапружання. Пры гэтым значна пагаршаецца разумовая працаздольнасць, адзначаецца рад нейраэндакрынных зрухаў, якія суправаджаюцца парушэннем сну, сэрцабіеннем, павышанай патлівасцю, некаторым павелічэннем артэрыяльнага ціску, галаўнымі болямі, а таксама болямі ў вобласці сэрца.

У радзе даследаванняў адзначаецца, што ўжо да канца першага семестра працаздольнасць зніжаецца ў 40% студэнтаў, а да вясны -- у 70%.

У гэтай сувязі важнае значэнне набываюць фізкультурныя мерапрыемствы ў рэжыме дня. Кожны дзень практычна здаровага чалавека павінен пачынацца з ранішняй зарадкі.

Трэба падкрэсліць, што ранішняя зарадка -- адзіны від фізкультуры, які, незалежна ад таго, падабаецца ён або не, у роўнай ступені карысны і неабходны кожнаму: дзіцяці і старому, настаўніку і вучонаму, пачынаючаму фізкультурніку і заслужанаму майстру спорту.

Пасля сну ўсе сістэмы і органы чалавека знаходзяцца ў стане паніжанай працаздольнасці, што праяўляецца ў адчуванні млявасці, санлівасці. З дапамогай самых простых гімнастычных практыкаванняў павышаецца тонус цэнтральнай нярвовай сістэмы, нармалізуюцца суадносіны працэсаў узбуджэння і тармажэння, актывізуецца дзейнасць сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм.

Ранішнюю гімнастыку пажадана выконваць на свежым паветры. Канкрэтных указанняў па аб'ёму нагрузкі завочна даваць нельга. Арыентавацца трэба, перш за ўсё, на самаадчуванне. Пасля выканання комплексу практыкаванняў павінен быць бадзёры настрой. Стомленасць, млявасць сведчаць аб тым, што нагрузку трэба некалькі зменшыць.

Акрамя таго, рэкамендуецца час ад часу выкарыстоўваць такі аб'ектыўны паказчык, як частата пульсу. У маладых людзей пасля выканання зарадкі пульс можа павышацца да 30-40 працэнтаў ад зыходняга ўзроўню. Калі на працягу 5-10 мінут частата сардэчных скарачэнняў /ЧСС/ прыходзіць у норму, то гэта сведчыць аб адпаведнасці атрыманай фізічнай нагрузкі магчымасцям арганізма. Зарадка павінна ўзбадзёрваць і не выклікаць адчування стомленасці, пасля якой хочацца адпачыць.

Абавязковым элементам зарадкі з'яўляецца загартоўванне. Яго сэнс заключаецца ў трэніроўцы тэрмарэгулятарнага апарата, якое трэба пачынаць з расцірання. Гэта найбольш "мяккая" водная працэдура, якая ажыццяўляецца з дапамогай губкі або ручніка, змочаных у вадзе.

Не трэба забываць, што рэгулярныя фізічныя практыкаванні садзейнічаюць супраціўленню арганізма радыяцыі.

У заключэнне хочацца нагадаць сцвярджэнне старажытнагрэчаскага мысліцеля Арыстоцеля: нішто так не знясільвае і не разбурае чалавека, як працяглае фізічнае бяздзеянне.

Падумайце аб гэтым.

**В.МАРЧАНКА, старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання.**

Ведайце факты аб ВІЧ-СНІДзе

# ЗАСЦЕРАГАЙЦЕСЯ "ЧУМЫ XX СТАГОДДЗЯ"

Усе больш актуальнай становіцца праблема СНІДу. Пагаршаецца сітуацыя ў Беларусі, а таксама ў Гомельскай вобласці, якую трэба расцэньваць як напружаную і пагражальную.

ВІЧ расшыфроўваецца так: Вірус Імунадэфіцыту Чалавека. У тым выпадку, калі вірус трапляе ў кроў, ён нападае на некаторыя клеткі /белыя шарыкі/ імуннай сістэмы, якая вядзе барацьбу з захворваннямі. ВІЧ разбурае здольнасць гэтых клетак змагацца з захворваннямі. Вірус выкарыстоўвае механізм аднаўлення клеткі для распаўсюджання самога віруса.

Інкубацыйны, скрыты перыяд, г.зн. час паміж укараненнем віруса ў кроў /ВІЧ-інфекцыя/ і з'яўленнем прыкмет СНІДу, можа працягвацца больш 10 гадоў. Такім чынам, СНІД -- канчатковая стадыя ВІЧ-інфекцыі. ВІЧ знойдзены ў большасці вадкасцей арганізму інфіцыраваных асоб, такіх як кроў, сперма і похвенныя выдзяленні. Інфекцыю выклікаюць толькі тыя вадкасці чалавечага арганізма, у якіх змешчаны высокія канцэнтрацыі ВІЧ.

**Перадача ВІЧ**

ВІЧ не перадаецца пры бытавых, сацыяльных кантактах.

**Як ВІЧ не распаўсюджваецца:**

праз прадметы, тэлефон, вопратку, прадукты, паветра, ваду; у басейне, на транспарце; пры кашлі і чханні; праз укусы насякомых, жывёлін, пры сумеснай вучобе, рабоце; пры рукапацісканні, абдымках, сяброўскіх пацалунках.

**Як распаўсюджваецца ВІЧ?**

— Ад мужчыны да мужчыны, ад мужчыны да жанчыны і наадварот у час "неабароненага" /без правільнага выкарыстання прэзерватыва/ сексуальнага кантакту; праз кроў; ад маці да яе яшчэ не народжанага дзіцяці.

**Рызыка і кроў**

Вірус можа распаўсюджвацца праз забруджаныя крывёй шпрыцы, іголкі, пры раненні кончыкамі іголак, парэзах, праколах вострымі інструментамі, нанясенні татуіроўкі.

Асабліва вялікая рызыка заражэння сярод наркаманаў, якія ўводзяць наркотыкі ўнутрывенна.

Што датычыцца небяспекі заражэння праз шпрыц, то ідэальны спосаб прафілактыкі — прымяненне аднаразовых шпрыцоў.

**Рызыка і секс**

Асабліва высокая рызыка заражэння пры выпадковых палавых кантактах /нават аднаразовым/, змене палавога партнёра.

У сексуальных паводзінах насельніцтва, моладзі ў прыватнасці, шырока распаўсюджаны фактары рызыкі да заражэння ВІЧ. Так, згодна сацыялагічным даследаванням, 9,6% падлеткаў удзельнічалі ў групавым сексе, мелі 2 і больш палавых партнёраў 62,9% падлеткаў. Кожная дваццатая жанчына і кожны чацвёрты мужчына хаця б аднаразова, а то і некалькі разоў, а іншы раз і дастаткова шмат удзельнічалі ў групавым сексе. 50% мужчын "калі-нікалі", а яшчэ 25% "часта", г.зн. 3/4 мужчын уступаюць у палавыя сувязі пасля ўжывання алкаголю.

СНІД не паддаецца лячэнню: лекаў, вакцыны супраць гэтай хваробы яшчэ не знойдзена. Вынік адзін — смерць.

Эпідэмія ВІЧ-інфекцыі распаўсюджваецца ва ўсім свеце нарастаючымі тэмпамі. Кожны 250-ы дарослы жыхар планеты заражаны ВІЧ. Памёрла ў свеце ад СНІДу больш 2,5 млн. чалавек. У Гомельскай вобласці выяўлена 12 ВІЧ-інфіцыраваных.

Толькі высокая маральная культура і бяспечныя сексуальныя паводзіны могуць выратаваць нас ад СНІДу.

**Т.ЛЫСЕНКА, заг. аддзела прафілактыкі Гомельскага абласнога Цэнтра прафілактыкі СНІДу.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе прыём у аспірантуру ў 1995 годзе

***з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасцях:***

матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лікаў; тэарэтычная фізіка; радыёфізіка; оптыка; фізіка цвёрдага цела; аналітычная хімія; батаніка; заалогія; фізіялогія чалавека і жывёлы; агульная і рэгіянальная геалогія; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў, сістэм і сетак; вылічальныя машыны, комплексы, сістэмы і сеткі; прымяненне вылічальнай тэхнікі, матэматычнага мадэліравання і матэматычных метадаў ў навуковых даследаваннях; палітычная эканомія; эканоміка, планаванне і арганізацыя кіравання народнай гаспадаркай і яе галінамі; беларуская мова; тэорыя і гісторыя педагогікі; тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізічнай культуры;

***без адрыву ад вытворчасці:***

матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лікаў; фізіка цвёрдага цела; батаніка; заалогія; генетыка; агульная і рэгіянальная геалогія; геафізіка; вылічальныя машыны, комплексы, сістэмы і сеткі; прымяненне вылічальнай тэхнікі, матэматычнага мадэліравання і матэматычных метадаў у навуковых даследаваннях; палітычная эканомія; эканоміка, планаванне і арганізацыя кіравання народнай гаспадаркай і яе галінамі; руская мова; беларуская мова; тэорыя і гісторыя педагогікі; тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізічнай культуры.

Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па філасофіі, замежнай мове і спецыяльнай дысцыпліне ў аб'ёме дзейнічаючай праграмы для ВНУ.

Прыём дакументаў і субяседаванне з загадчыкамі кафедр або мяркуемымі навуковымі кіраўнікамі -- да 10 верасня 1995 года.

Заява аб прыёме ў аспірантуру падаецца на імя рэктара з дадаткам: асабістага лістка па ўліку кадраў з 3-мя фотакарткамі; аўтабіяграфіі; характарыстыкі-рэкамендацыі з апошняга месца працы; копіі дыплома аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы і копіі выпіскі з заліковай ведамасці; спісу надрукаваных навуковых прац, вынаходніцтваў і справаздач аб навукова-даследчай рабоце, а пры іх адсутнасці -- рэферата па выбранай навуковай спецыяльнасці; выпіскі з пратаколу пасяджэння вучонага савета для асоб, рэкамендаваных у аспірантуру вучонымі саветамі ВНУ (факультэтаў) непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы; пасведчання па форме 2.2 аб здачы кандыдацкіх экзаменаў для асоб, поўнасцю або часткова здаўшых кандыдацкія экзамены; меддаведкі (форма №086-у); выпіскі з працоўнай кніжкі.

Уступныя экзамены праводзяцца з 1 па 30 кастрычніка 1995 года.

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104, аддзел аспірантуры. Тэл. 56-21-29.

**РЭКТАРАТ**

*Весёлы перапынак*

## МАЛАЯ СТУДЭНЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ...

**Аспірант** -- чалавек, які глыбока крыўдзіцца пасля пытання аб тым, калі ён збіраецца абараняць дысертацыю.

**Вада** -- форма матэрыі, без якой не могуць быць паўнацэннымі адказы студэнтаў на экзаменах.

**Геній** -- студэнт, які вывучыў усю дадатковую літаратуру.

**Ахвяра** -- студэнт, які не змог у час экзамена падмануць выкладчыка.

**Знаёмы** -- чалавек, блізкі настолькі, каб вы змаглі пазычыць у яго грошы, але не настолькі, каб вы яму пазычалі.

**Курсавы чарцёж** -- чарцёж з тлумачальным запісам, у якім матэматычна тлумачыцца, чаму спраектаваны агрэгат не можа працаваць.

**Гультай** -- студэнт, які ўвесь час збіраецца нешта рабіць.

**Любімы выкладчык** -- чалавек, якому не застаецца месца ў перапоўненай аўдыторыі.

**Настойлівы** -- студэнт, якога выгналі некалькі разоў за дзверы, а ён урываецца праз акно.

**Адказ /правільны/** -- прыемная нечаканасць, на якую выкладчык менш за ўсё спадзяецца.

**Работа** -- універсальнае панацэе.

Па-студэнцку гучыць так: "Без працы -- цяжка, але мы цяжкасцей не баімся!"

**Рэферат** -- спісаны які-небудзь даклад /або артыкул/, прыпаднесены студэнтам у якасці асабістага.

**Рызыка** -- высакародная справа, калі не ты разыкуеш.

**Расклад** -- гэта рэч, пры складанні якой ніхто не думае ні пра студэнта, ні пра выкладчыка, а толькі пра аўдыторыю.

**Стыпендыя** -- аплата за страх у час экзаменаў. У нашы дні -- гэта залішняя дабаўка да субсідый "продкаў".



ЧЭМПІЁН. Фота Чысціка.

Спорт

## ТОЛЬКІ ТРЭЦЯ

Завяршыўся чэмпіянат Беларусі па гандболу сярод жаночых каманд. Вышэйшыя ўзнагароды, як і ў папярэднія гады, заваявалі спартсменкі мінскага "Політэхніка". Другі радок у турнірнай табліцы заняла каманда "Політэхнік"-2 -- рэзервны састаў галоўнай каманды рэспублікі. Студэнткам нашага універсітэта на гэты раз дасталіся бронзавыя ўзнагароды. Нагадаем, што некалькі гадоў запар яны былі сярэбранымі прызёрамі чэмпіянату. Дарэчы, на такім жа месцы ў сёлетнім чэмпіянаце аказалася і наша мужчынская каманда па ручному мячу.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ выказваюць глыбокае спачуванне асістэнту **ХАНЕНЮ Сяргею Іванавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры эканамічных тэорый выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **ДАЙНЭКУ Уладзіміру Сямёнавічу** з выпадку трагічнай гібелі **ДАЧКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.

За някасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 312
Падпісана да друку 2.06.95.